УДК 373.3.016:504

# ВЫКАРЫСТАННЕ КОЎЧЫНГ-ІНСТРУМЕНТАЎ ПА ПРАДМЕЦЕ “ЧАЛАВЕК І СВЕТ” ЯК СРОДАК РАЗВІЦЦЯ ПАЗНАВАЛЬНАЙ АКТЫЎНАСЦІ ВУЧНЯЎ

**Варвашэвіч Людміла Аляксееўна**
настаўнік пачатковых класаў
ДУА “Соснаўская сярэдняя школа № 1 Любанскага раёна”
аг. Сосны, Рэспубліка Беларусь

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца педагагічны коўчынг як эфектыўны метад рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу. Апісваюцца коўчынг-інструменты, якія выкарыстаоўваюцца аўтарам на ўроках па прадмеце “Чалавек і свет”.

*Кампетэнтнасць і педагагічны коўчынг.* Праблема кампетэнтнаснага падыходу ў адукацыі на сённяшні дзень з’яўляецца адной з самых актуальных. Тып чалавека сучаснасці і бліжэйшага будучага – самастойны, камунікабельны, які ўмсс працаваць у групе, гатовы і здольны пастаянна вучыцца новаму, самастойна здабываць і прымяняць патрэбную інфармацыю. Кампетэнтнасны падыход вылучае на першае месца не інфармаванасць вучняў, а ўмснне выращаць праблемы, якія ўзнікаюць у практычнай дзейнасці, і авалоданне спосабамі дзейнасці. Здабыць кампетэнтнасць можна толькі пры самастойнай пастаноўцы праблем, пошуку неабходных для вырашэння ведаў і вызначэння іх шляхам даследавання. Гэта прадугледжвае выкарыстанне новых педагагічных тэхналогій у навучанні, змяненне структуры прадмета і ўрока, арганізацыі адукацыйнага працэсу, а таксама ўсведамленне новай ролі педагога ў гэтым працэсе. Настаўнік з транслятара ведаў і кантралёра становіцца партнёрам, супрацоўнікам па іх здабыванні і коўчам, які суправаджае навучэнца ў яго індывідуальна-асобасным развіцці. Творчаму навучанню, дасягненню поспеху спрыяе новы адукацыйны метад – педагагічны коўчынг [1; 2].



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Коўчынг як сучасная тэхналогія дазволіць падрыхтаваць новае пакаленне маладых спецыялістаў – упэўненых, самадастатковых, мэтанакіраваных, пазітыўных, якія ўмеюць жыць і працаваць у гармоніі з самім сабой. Коўчынг (ад англ. Coaching – трэнерства), па словах яго заснавальніка Джона Уітмара, – гэта прафесійная дапамога чалавеку ў вызначэнні і дасягненні яго асабістых і прафесійных мэт.

Першапачатковай перадумовай коўчынгу з'яўляецца вера ў тое, што кожны чалавек – унікальная творчая асоба, здольная дабівацца неверагодных поспехаў у жыцці. Абставіны, перакананні, сфарміраваныя пад уплывам асяроддзя, стрымліваюць развіццё патэнцыялу асобы, якая валодае неабходнымі рэсурсамі для ўласнай рэалізацыі. Коўчынг дазваляе паказаць, што ўсе людзі валодаюць значна большымі ўнутранымі здольнасцямі, чым тыя, што яны праяўляюць у сваім паўсядзённым жыцці; што ў кожнага чалавека ўжо ёсць усе неабходныя рэсурсы для дасягнення поспеху; што навучанне адбываецца не на памылках, а на поспеху; што трэба арыентавацца не на праблему, а на яе рашэнне; што прынятце, адкрытасць і давер з'яўляюцца ключом да ўзаемадзеяння. У шырокім сэнсе коўчынг – гэта такая форма кансультацыйнай падтрымкі, якая дапамагае чалавеку дасягаць значных для яго мэт шляхам мабілізацыі ўнутранага патэнцыялу, развіцця неабходных здольнасцей і фарміравання новых навыкаў. Згодна з больш вузкім азначэннем, коўчынг – гэта працэс выяўлення мэт чалавека і выпрацоўка аптымальных шляхоў іх дасягнення.

На сучасным этапе, кажучы пра коўчынг ў адукацыі, дакладней будзе выкарыстоўваць тэрмін "коўчынгавы падыход". Асаблівасці коўчынгу ў адукацыйнай дзейнасці заключаюцца ў тым, што ўзаемадзеянне "настаўніка-коўча" арыентавана на канкрэтнага навучэнца і таму мае вялікі эфект. Выкладчык-коўч выступае не ў якасці кансультанта, які дае парады, а ў ролі прафесійнага натхняльніка на пошук рашэнняў адукацыйных задач, раскрываючы творчы патэнцыял вучня. Такім чынам, коўчынг як педагагічны стыль – гэта ўзаемадзеянне, заснаванае на раўнапраўным партнёрстве, якое спрыяе раскрыццю патэнцыялу вучняў, павышэнню адказнасці, матывацыі і эфектыўнасці. Пры гэтым настаўнік-коўч актыўна слухае, задае пытанні, натхняе, матывуе, здымае трывогу і стрэс. Прымяненне коўчынгава падыходу ў педагагічнай практыцы вызначае новую ролю педагога: педагог не проста перадае веды, ён – трэнер талентаў, раскрывае свой патэнцыял і патэнцыял школьнікаў.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

*Коўчынг-інструменты.* У сваёй педагагічнай дзейнасці па прадмеце “Чалавек і свет” мы распрацавалі і прымяняем наступныя коўчынг-інструменты:

*1. Графічныя дыктанты (праз кірункі свету).*

1.1. Асноўныя (Пн, Пд, З, У).



Так, пры вывучэнні ў 3 класе тэмы “Расліны лесу” вучні праз графічны дыктант (2 клетачкі на поўнач, 1 – на ўсход, 1 – на поўнач, 2 – на ўсход, 2 – на поўдзень, 1 – на ўсход, 1 – на поўдзень, 4 – на захад) малююць “П’едэстал”.



Школьнікі называюць, дзе яны могуць яго бачыць. Адно з меркаванняў, што на яго становяцца пераможцы, напрыклад, спартсмены. Праводзіцца аналогія з раслінамі: дрэвы вышэйшыя, галоўныя, таму – 1 ярус; кусты ніжэй, таму 2 ярус; самыя невысокія травы, таму іх адносяць да 3 яруса.

1.2. Асноўныя+прамежкавыя (Пн, Пд, З, У, ПнЗ, ПнУ, ПдУ).



Пры знаёмстве з тэмай “Жывёлы – насельнікі мораў, акіянаў” праводзіцца аналагічная работа, толькі дабаўляюцца прамежкавыя напрамкі. У выніку атрымліваецца, напрыклад, выява краба.

1.3. Сіметрычныя.

Пад кіраўніцтвам настаўніка пры вывучэнні тэмы “Расліны лугу” вучні праз графічны дыктант па кірунках свету робяць выяву паловы кветкі льну. Далей яны вырашаюць задачу па дамалёўцы другой паловы.

2.*Выкарыстанне вяроўкі.*

2.1. Па даўжыні. Вяроўка выкарыстоўваецца для візуальнага ўспрымання даўжыні і вышыні прадмета. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы “Расліны мораў і акіянаў” паказваем, што водарасць можа дасягаць даўжыні 20 м (загадзя адрэзана вяроўка адпаведнай даўжыні); пры знаёмстве з раслінамі лесу паведамляецца і паказваецца вышыня сярэдняй сасны ў Беларусі (40 м) і параўноўваецца з секвояй, якая ў 3 разы вышэйшая, і г. д.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

2.2. Па дыяметры. Выкарыстоўваецца для візуальнага ўспрымання акружнасці прадмета. Напрыклад, акружнасці баабаба (25 м), яго кветкі (5 м).

*"Чарговы" лішні.* Пры вывучэнні тэмы "Дзікарослыя расліны" прапануюцца выявы хваёвых дрэў: сасны, елкі, піхты, лістоўніцы, кедра, псеўдатсугі.

Вучні атрымліваюць пытанні: Што агульнага маюць дрэвы? Якое дрэва лішняе па месцы пражывання? (кедр, бо ў Беларусі не расце). Выкрэсліваем яго. З астатніх знайдзіце лішняе па спосабе прымацавання шышак (паказ галінак). Выкрэсліваем піхту, бо шышка прымацоўваецца непасрэдна да галіны. Сярод астатніх знайдзіце лішняе, выкарыстоўваючы веды пра іх хвою. Выкрэсліваем лістоўніцу, бо скідвае хвою на зіму.

Па аналогіі вучні спрабуюць самастойна складаць прадметныя рады, знаходзячы "лішніх" па пэўных характарыстыках.

3. *"Прафесіі" аб'ектаў.*

Гэты інструмент дазваляе не толькі абагуліць веды, але і выступае своеасаблівым прафарыентацыйным сродкам. Мэта: састаўленне вучнямі спісу прафесій, якія выконваюць тыя ці іншыя аб'екты (расліны, жывёлы).

Напрыклад, прафесіі мураўёў, пчол, дрэў.

*4. Праблемныя пытанні з практычнымі рашэннямі.* Выкарыстанне праблемных пытанняў, якія патрабуюць практычных рашэнняў, дазваляе развіваць не толькі псіхічныя працэсы, але і поўнасцю рэалізоўваць прынцып сувязі тэорыі з практыкай. Напрыклад, пры вывучэнні тэм "Зямля з блакітнымі вачамі" (4 клас) або "Водныя багацці нашай краіны. Рака і возера" (3 клас) можна прапанаваць з дапамогай карты адказаць на пытанне-задачу: адна група турыстаў плыла па Бярэзіне ад вытоку да вусця, а другая – з вусця да вытоку. Але яны не сустрэліся. Чаму? (Адказ: яны плылі па розных рэках. У Беларусі дзве Беразіны: адна – прыток Дняпра, другая – Нёмана).

*5. "Пазнай".* Вучням прапануецца адгадаць слова па некалькіх падказках, састаўленых па прынцыпе: ад невядомых фактаў – да вядомых. Напрыклад, пры ўвядзенні ў тэму "Звяры (млекакормячыя)":

1. Гэты прадукт сталі ўжываць больш за 6000 гадоў таму назад.
2. Змяшчае больш за дзвесце важных кампанентаў.
3. Сапраўдны эліксір росту.
4. Царыца Клеапатра купалася ў гэтым прадукце, каб захаваць сваю маладосць і здаровы колер скуры.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

5. Гэта напітак белага колеру.

6. Гэта першы прадукт любога чалавека.

7. З гэтага прадукта робяць смятану, масла, сыр.

– Гэта малако, прадукт, якім кормяць сваіх дзіцянят усе звяры.

Такім чынам, выкарыстанне коўчынг-інструмснтаў актывізуе вучняў, дапамагае паверыць у сябе і свае магчымасці, робіць заняткі цікавымі і эфсктыўнымі.

## Спіс літаратуры


1. Андреева, М. О. Коучинг как профессионально-педагогическая компетентность современного учителя / М. О. Андреева [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://coachingineducation.ru/kouching-kak-professionalno-pedagogicheskaya-kompetentnost-sovremennogo-uchi telya/. – Дата доступу: 18.11.2020

2. Костяева, Н. А. Коучинг как инновационная технология повышения профессионального мастерства педагогов / Н. А. Костяева, Е. В. Кузнецова // Педагогическая мастерская. – 2015. – №9 (45). – С. 19–22. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://www.e-osnova.ru/PDF/osnova_14_45_12682.pdf .– Дата доступу : 15.11.2020


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова